арыентавацца ў гісторыі і сучасным стане асноўных канфесій, пазнаёміцца са свяшчэннымі тэкстамі вядучых рэлігійных традыцый, ведаць гісторыю і сучасны стан рэлігійных накірункаў на Беларусі, мець навыкі аналізу рэлігійных тэндэнцый у класічнай і сучаснай літаратуры і мастацтве. Усе гэтыя праблемы немагчыма разглядзець у межах невялікага курса гісторыі рэлігіі.

Агульны курс «Гісторыя рэлігіі» трэба разглядаць як аглядны, пачатковы. Ён павінен знаёміць студэнтаў першай ступені адукацыі з абмежаваным колам тэм. Напрыклад: агульнае паняцце аб рэлігіі; тыпалогія рэлігій; логіка гістарычнай эвалюцыі рэлігіі, яе галоўныя этапы; асновы параўнальнага рэлігіязнаўства; станаўленне і сучасны стан сусветных рэлігій; асновы біблеістыкі; рэлігія ў нацыянальнай гісторыі. Гэты мінімум рэлігіязнаўчых ведаў прапануецца студэнтам усіх факультэтаў. Але магчымы розныя акцэнты ў вывучэнні агульнай праграмы. На факультэце БІС вялікае значэнне мае знаёмства з Біблiяй, і іншымі рэлігійнымі тэкстамі. Студэнтам факультэтаў культуралогіі і мастацкай творчасці трэба добра ўяўляць рэлігію як частку культуры, яе ўплыў на розныя віды мастацтва.

На другім этапе навучання ва універсітэце культуры мэтазгодна прапанаваць шэраг спецкурсаў і спецсемінараў рэлігіязнаўчага накірунку. На кафедры філасофіі падрыхтаваны спецкурс «Рэлігійнае жыццё на Беларусі: гісторыя і сучаснасць», які можа адрасавацца студэнтам усіх факультэтаў. У кафедры ёсць пэўная дамоўленасць аб падрыхтоўцы прадстаўнікамі царквы і іншых рэлігійных арганізацый спецкурсаў па гісторыі і сучаснай дзейнасці розных канфесій на Беларусі.

Шэраг рыхтуемых спецкурсаў і спецсемінараў носіць спецыяльны характар і адпавядае профілю факультэтаў і спецыялізацый. Студэнтам факультэта інфармацыйна-бібліятэчных сістэм карысна ўдзельнічаць у спецсемінары па біблеістыцы. Магчыма распрацоўка курса «Свяшчэнныя тэксты сусветных рэлігій». Вельмі карысным для студэнтаў названага факультэта быў бы курс «Бібліяграфія рэлігійнай і рэлігіязнаўчай літаратуры».

Для студэнтаў факультэта мастацкай творчасці можна прапанаваць спецкурсы, у якіх разглядаліся б рэлігійныя тэндэнцыі ў мастацтве, напрыклад «Рэлігійныя тэндэнцыі ў сучаснай літаратуры», «Біблейскія матывы ў класічным і сучасным мастацтве» і іншыя.

Студэнтам факультэта культуралогіі карысны былі б спецкурсы па багаслоўскай культуралогіі, па аналізу рэлігіі як з'явы культуры, па параўнальнаму рэлігіязнаўству.

Кафедра філасофіі можа забяспечыць навуковае кіраўніцтва курсавымі і дыпломнымі працамі рэлігіязнаўчай накіраванасці.

Лапіна С.Б., прафесар
Лапін А.В., дацэнт

## НАВУЧАЛЬНЫ ПРАЦЭС ЯК ТВОРЧАЯ, НАВУКОВА-ПАЗНАВАЛЬНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ

Кожны этап у развіцці грамадства патрабуе новых падыходаў да арганізацыі сістэмы адукацыі. Наша краіна трохі спазнілася з пераходам на тую ступень развіцця, якую перажывае сучасная чалавечая супольнасць і якая атрымала назву «інфармацыйная рэвалюцыя». Даганяць тых, хто ўразумеў гэтую з'яву раней, цяжка, але вельмі неабходна. Перабудова сістэмы адукацыі - гэта якраз той крок, які патрэбен дзеля таго, каб наблізіцца да цывілізаваных стандартаў сучаснасці.

У гэтых варунках вышэйшая школа бачыцца ў якасці сапраўднага генератара новых напрамкаў грамадскага жыцця. Але ж дзеля гэтага ёй самой патрэбна зрабіць шмат чаго, каб стасавацца з вельмі адказнымі задачамі, якія ставіць перад ёй жыццё. Перш-наперш сказанае тычыцца сутнасці і формы арганізацыі навучальнага працэсу.

У сучасных умовах нельга даць студэнту вычарпальную інфармацыю нават па нейкаму аднаму вузкаму накірунку навуковых ведаў таму, што навуковая інфармацыя вельмі хутка абнаўляецца. Гэта тычыцца не толькі вынікаў навуковых даследаванняў, але і тых шляхоў, метадаў, сродкаў, якія выкарыстоўваюцца рознымі навукоўцамі. Такое становішча робіць неабходным не проста сумяшчальнасць навучальнага і навукова-пазнавальнага працэсаў, але больш таго - ператварэнне навучання ў сапраўднае даследаванне.

Зразумела, што цяжка патрабаваць ад студэнта-першакурсніка валодання навыкамі навукоўца, але ж менавіта гэтаму і павінна вучыць вышэйшая навучальная ўстанова. Трэба толькі вызначыць, як яна гэта будзе рабіць. Вось тут якраз і павінна адыграць сваю станоўчую ролю двухступенная сістэма вышэйшай адукацыі.

На першай ступені студэнты павінны атрымаць неабходную ім агульнадукацыйную і прафесійную інфармацыю, а таксама засвоіць логіку і метадалогію навуковага пазнання, даследавання. У шэрагу вышэйшых навучальных устаноў з гэтай мэтай уводзяцца курсы «Асновы навуковага даследавання», «Сістэмны аналіз» і іншыя курсы, якія даюць навучэнцам агульнае ўяўленне аб сучасным навуковым працэсе і методыцы яго ажыццяўлення. Яны могуць быць адаптаваны з улікам канкрэтных накірункаў дзейнасці кожнай навучальнай установы. Але ж галоўны сэнс такіх дысцыплін зводзіцца да вывучэння асноўных сучасных накірункаў творчай дзейнасці, сутнасць якой - у вывучэнні спосабаў атрымання прынцыпова новых вынікаў у

кожнай галіне прафесійнай дзейнасці. Нягледзячы на адрозненні навукова-даследчых падыходаў, у іх ёсць шмат аднолькавага, тыповага, што і знаходзіць адлюстраванне ў абагульняючых працах па метадалогіі і творчай, у тым ліку і навуковай, дзейнасці. Аваладанне трывалымі ведамі на першай ступені адукацыі (неабходная агульнаадукацыйная і прафесійная інфармацыя+веды аб яе атрыманні і аднаўленні) дазваляе перайсці да другой ступені. Вось тут навучальны працэс павінен пераўтварацца ў сапраўдны навуковы пошук, у якім сумесна дзейнічаюць навучэнец і выкладчык. Задача першага заключаецца ў аваладанні практычнымі навыкамі навукоўца, даследчыка. Гэта магчыма ажыццявіць толькі ў тым выпадку, калі выкладчык сам будзе дэманстраваць узоры навуковага пошуку.

На другой ступені навучання ў ВНУ патрэбна ўвядзенне такіх формаў заняткаў, якія б дазволілі арганізаваць сумесную дзейнасць, узаемадзеянне выкладчыка і студэнта ў разглядзе і вырашэнні найбольш актуальных навуковых праблем, якія павінны вызначацца па кожнай дысцыпліне асобна. Здаецца, што ў гэтым сэнсе можна перабудаваць змест і традыцыйныя формы навучальнага працэсу, надаўшы ім новую сутнасць. З гэтай нагоды выкладчык у праблемнай лекцыі, напрыклад, павінен расказваць не аб тым, што трэба ведаць студэнту, і нават не аб тым, што трэба рабіць гэтаму студэнту, даследуючы вывучаемую з'яву. Лекцыя можа быць пабудавана зусім інакш, у ёй выкладчык-навуковец як бы гаворыць студэнту: «Я не кажу табе, што ты павінен разглядаць гэту ці падобную праблему менавіта так, але я ведаю, як яе разглядаюць іншыя навукоўцы, і з гэтай нагоды я маю свой падыход, таму я разглядаю гэту праблему менавіта такім чынам». Такое стаўленне да праблемы ўводзіць навучэнца ў творчую лабараторыю выкладчыка, ён становіцца саўдзельнікам свайго настаўніка-навукоўца. Вядома, што толькі ў гэтых выпадках магчыма засваенне тых неабходных кожнаму творчаму працаўніку так званых эмпірычных эўрыстык, набору эмпірычных правіл дзейнасці з вывучаемым прадметам, якія не ўваходзяць у агульныя лагічна аформленыя правілы, але без якіх немагчыма здзейсніць любы творчы працэс.

Такім жа чынам можна будаваць і семінарскія ці практычныя заняткі, дзе выкладчык і студэнты мяняюцца ролямі, але ж працягваюць супрацоўніцтва.

Мабыць, менавіта ў гэтым сэнсе мы маем права гаварыць аб педагогіцы супрацоўніцтва, якая ў вышэйшай школе павінна знайсці трывалае ўвасабленне. І перш за ўсё - у пераўтварэнні навучання ў творчы, навукова-даследчы працэс.

Самушчык Т.У.,
аспірантка

## РОЛЯ ФІЛАСОФСКАЙ АДУКАЦЫІ Ў КОМПЛЕКСНЫМ ВЫВУЧЭННІ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ І СУСВЕТНАЙ КУЛЬТУРЫ

Комплекснае вывучэнне нацыянальнай і сусветнай культуры немагчыма сёння без удасканалення гуманітарнай адукацыі, і перш за ўсё філасофскай, бо вывучэнне філасофіі, яе гісторыі аказваецца сапраўднай школай духоўнага самаўзбагачэння, практыкумам духоўнай самасвядомасці. Далучэнне да філасофскай спадчыны прадугледжвае не толькі фарміраванне светапогляду асобы, павышэнне яе эрудыцыі, але і асабістае духоўна-практычнае далучэнне да філасофскага свету. Філасофія выступае ў якасці механізма адаптацыі культуры да ўсіх змен, у рамках якога мы можам супаставіць усе формы асваення рэчаіснасці чалавекам. Філасофія як інтэгратар культуры не можа абмяжоўваць сябе нейкім адным спосабам асваення рэчаіснасці, нейкай адной формай грамадскай свядомасці. Таму і праграма выкладання філасофіі павінна быць своеасаблівым зрэзам сацыяльна арганізаванай рэфлексіі, у якую ўваходзяць дыялектыка (як вучэнне аб сукупнасці прынцыпаў і нормаў, на падставе якіх чалавек адлюстроўвае навакольны свет і будуе яго карціну), аксіялогія (як вучэнне аб асновах выбару і каштоўнасных арыентацыях) і вучэнне аб свядомасці ( як абгрунтаванне магчымасцей камунікацыі).

Разглядаючы праблему ўдасканалення філасофскай адукацыі моладзі, зазначым, што працэс выкладання філасофскіх дысцыплін сёння перажывае час вызвалення ад вынікаў дзеяння механізма тармажэння ў выглядзе элементаў дагматызму, схаластыкі, адарванага ад жыцця тэарэтызавання, ілжывых стэрэатыпаў і інш. Гэта патрабуе ўдасканалення структуры і метадаў выкладання філасофскіх дысцыплін, пераарыентацыі філасофскай адукацыі. Цэнтрам увагі грамадазнаўства павінен стаць чалавек з яго рэальнымі жыццёвымі праблемамі, патрабаваннямі і інтарэсамі.

Важным сродкам і неабходнай умовай у вырашэнні праблем, звязаных з філасофскай адукацыяй, з'яўляецца выкладанне філасофіі з улікам профілю ВНУ. Тут важныя два моманты: па-першае, выкладанне філасофіі неабходна наблізіць да зместу прафілюючых дысцыплін ВНУ; па-другое, напоўніць філасофскім зместам выкладанне некаторых прыродазнаўчых і прыродазнаўча-тэхнічных дысцыплін, бо толькі філасофская адукацыя дае магчымасць пераадолець тэхнакратычнае і вузкапрафесійнае мысленне, выхоўвае духоўна багатую асобу,